# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*А. І. БАБКО*

## “БАРАЦЬБА ЗА ПРЫЗНАННЕ” ЯК ФЕНОМЕН БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

*На аснове пераасэнсавання ў адпаведным кантэксце раскрытай у філасофіі Гегеля дыялектыкі “барацьбы за прызнанне” аналізуюцца складаныя сацыякультурныя працэсы, што адбываліся падчас фарміравання беларускай нацыі. Разглядаюцца істотныя характарыстыкі феномена барацьбы за прызнанне з пункту гледжання яго рэалізацыі ў гістарычным развіцці беларускага народа, аналізуюцца праявы дадзенага феномена ў духоўных пошуках выдатных дзеячаў беларускай культуры.*

Станаўленне беларускай нацыі і нацыянальнай культуры адбывалася ў складаных умовах, і таму ў дадзеным працэсе выяўляюцца істотныя моманты, якія дазваляюць інтэрпрэтаваць яго як своеасаблівы варыянт “барацьбы за прызнанне”, феномена, з класічнай глыбінёй апісанага Гегелем. Згаданы працэс не разглядаўся ў падобным ракурсе ў навуковай літаратуры. Такі падыход падаецца, аднак, зусім не бясплённым і дастаткова актуальным, паколькі формы скажонай этнічнай самасвядомасці застаюцца надзвычай пашыранымі ў нашай культурнай прасторы.

Феномен барацьбы за прызнанне суадносіцца Гегелем у яго “Энцыклапедыі філасофскіх навук” з эпохай утварэння дзяржаў [9, с. 352], а вось гістарычная лакалізацыя адпаведных разваг у “Фенаменалогіі духу” не даецца з такой пэўнасцю самім аўтарам і мае статус дыскусійнага моманту ў гістарычна-філасофскай літаратуры [11, с. 365–368]. І хаця ў сваёй пэўнай і выразнай форме барацьба за прызнанне і дыялектыка гаспадара і раба характарызуюць першапачатковыя этапы гістарычнага развіцця чалавецтва, тым не менш дадзены феномен з некаторымі асаблівасцямі ў трансфармаваным выглядзе (часам, аднак, і ў класічна выразным абліччы, як, напрыклад, плантацыйнае рабства ў Амерыцы напачатку Новага часу) зноў і зноў назіраецца ў згаданым працэсе. Вось і беларускі народ мусіў прайсці праз гэтую пакутлівую дыялектыку падчас свайго фарміравання як нацыі, што моцна паўплывала на яго самасвядомасць, развіццё яго культуры.

Гегель указвае, што прызнанне можа быць дасягнутае толькі ў выніку барацьбы; першая, найабстрактнейшая форма гэтай барацьбы – змаганне не на жыццё, а на смерць. Смерць, аднак, не з’яўляецца непазбежным вынікам супрацьстаяння носьбітаў самасвядомасці, і, як адзначае Гегель, калі нейкі з іх не здолее ўзняцца над страхам смерці, дык у такім выпадку паўстае дачыненне гаспадара і раба [10, с. 149]. Але адносіны панавання і рабства маюць дыялектычны характар. Падстава згаданай дыялектыкі – жахлівы досвед раба. Раб сапраўды перажыў штось жахлівае: не проста спалохаўся з той ці іншай нагоды, у той ці іншы момант, але адчуў страх, што ахапіў усю яго сутнасць, скалынуў яго так, што ўсё застылае і здранцвелае ў ім затрэслася і прыйшло ў рух [10, с. 153]. Гэта першая перадумова памкнення да свабоды ў халопскай самасвядомасці. Але ж навязаныя рабу гаспадаром слугаванне і праца фарміруюць яго, выводзяць на новы ўзровень самаўсведамлення, усведамлення сябе як свабоднага чалавека [10, с. 154], як носьбіта агульначалавечага пачатку (“усеагульнай самасвядомасці” паводле тэрміналогіі Гегеля [9, с. 353]).

Усе згаданыя моманты, што выступаюць як грунт “рэфлексіі свабоды”, выяўляюцца ў гістарычным досведзе беларускага народа. Хаця нельга сцвярджаць, што нацыянальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгнёт, які беларусам наканавана было перажыць на працягу некалькіх стагоддзяў, быў вынікам іх маладушша ці слабасці ў барацьбе за прызнанне, вынікам таго, што наш народ не здолеў у згаданай барацьбе ўзняцца над страхам смерці, аддаўшы перавагу несвабоднаму існаванню, тым не менш яго гісторыя прасякнута падзеямі, якія мусілі быць падставай для жахлівых перажыванняў. Узгадаем спусташальныя войны*, што зноў і зноў скалыналі нашу зямлю і не маглі не выклікаць у беларусаў пачуццё найглыбейшага, "экзістэнцыяльнага" страху. З іншага боку, апалячванне і русіфікацыя, праз якія мусіў прайсці наш народ, паставілі яго перад пагрозай этнічнай смерці – узрушэнне, якое хаця і не выступіла яўна ў эпіцэнтры яго духоўнага жыцця, застаўшыся найперш у глыбінях бессвядомага, тым не менш не страціла ад гэтага сваёй сілы.

Паланізацыя і русіфікацыя – гэта найяскравейшыя сведчанні падпарадкаванага, падуладнага становішча беларусаў на працягу доўгага гістарычнага перыяду. Але панаванне над нашым народам "чужынцаў-братоў" мела не толькі этнічны, нацыянальны аспект, бо яму было наканавана пераҗыць і самы жорсткі эканамічны, сацыяльны і маральна-духоўны ўціск. Здрада беларускай шляхты этнічным інтарэсам, народным і сваім уласным, прывяла да таго, што носьбіт беларускай мовы і культуры атаясамліваўся з селянінам, з прыгнечаным, з халопам. Падначаленае, падуладнае становішча беларуса ў сістэме дачыненняў панавання і падпарадкавання азначала, аднак, што ён мусіў прайсці праз апраметную паднявольнай працы, праз звязаную з ёй бязлітасную муштру.

Такім чынам, у працэсе самастварэння сябе як нацыі беларусы павінны былі пераадолець у сабе самасвядомасць "халопскую" і ўзняцца да "ўсеагульнай самасвядомасці". Яны павінны былі ўсвядоміць сябе адметным, адрозным ад іншых этнасаў народам, які ў гэтай адметнасці выступае разам з тым як носьбіт агульначалавечага пачатку і таму з'яўляецца роўным і раўнапраўным з іншымі народамі.

Гэтая задача была ўзнятая з глыбіняў народнага духу да ўзроўню выразна акрэсленай, свядомай мэты выдатнымі гістарычнымі дзеячамі Беларусі. Назавем у дадзенай сувязі найперш імя Кастуся Каліноўскага. З каласальнай духоўнай сілай ён увасобіў у сваім жыцці, у сваёй практычна-палітычнай дзейнасці і ў сваім светапоглядзе магутнае памкненне да свабоды, што выспявала ў беларускай душы ў працэсе фарміравання нашай нацыі. Яго змаганне за народную справу было падрыхтаванае пакутлівай і нястомнай духоўнай працай беларускага народа, яно было вынікам і плёнам гэтай працы і штуршком для далейшых тытанічных высілкаў дзеля дасягнення свабоднага і справядлівага грамадства. У сваім запавеце беларускаму народу Кастусь Каліноўскі заклікае яго "ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную" [4, с. 46], гэта значыць спалучыць у сваім змаганні агульначалавечы і адметны, нацыянальны пачатак.

У дадзенай сувязі А.С.Майхровіч указвае на пэўную аднабаковасць поглядаў нашага выдатнага рэвалюцыянера (як і рэвалюцыйных дэмакратаў увогуле), у якіх, на думку даследчыка, дамінуе "механістычнае супадзенне агульнага і адзінкавага, імкненне да простага гарманічнага іх спалучэння" [5, с. 194]. Неабходна адзначыць, што ў Кастуся Каліноўскага мы сапраўды не знойдзем глыбокага аналізу разнастайных і вострых калізій індывідуальнага і нацыянальнага, індывідуальнага і агульначалавечага, але, магчыма, якраз таму, што ён сам здолеў поўна і яскрава ўвасобіць у сабе і агульначалавечы, і нацыянальны пачаткі. З іншага боку, эпоха Кастуся Каліноўскага – гэта эпоха, што патрабавала агульнанароднага чыну, і жыццё, творчасць і духоўныя пошукі змагара за народныя інтарэсы цалкам адпавядаюць дадзенаму гістарычнаму кантэксту.

Духоўная, светапоглядная аснова гэтага змагання мае агульначалавечы характар: "Сягоння ўсе ўжэ паразумнелі, усе ўжэ мужыкі талкуюць, што Бог стварыў чалавека, каб ён карыставаў з вольнасці справядлівай" [4, с. 30]. Дадзеная агульначалавечая аснова павінна здзейсніцца, аднак у нацыянальных формах, і Кастусь Каліноўскі падкрэслівае грунтоўную значнасць гэтага здзяйснення для нашай нацыятворчасці на ўсіх яе кірунках. Так, у дзяржаўна-палітычнай сферы "нам адно сільна з шчырай верай за сваё стаяць трэба, а ронд наш павінен быць на ўсё чуткі, каб мог для дабра народнага за ўсяго карыставаць"

* Трагічны характар гэтых войнаў для беларускага народа з усёй сілай і відавочнасцю раскрываецца ў працах гісторыкаў [3, с. 154–159, 168].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[4, с. 44], у галіне народнай адукацыі неабходна змяніць такую сітуацыю, калі “адно ўчаць у школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску” [4, с. 32], у рамках ваеннага будаўніцтва патрэбна дасягнуць стандартаў вольнай, дэмакратычнай дзяржавы, грамадзянін якой ”не ідзе ў рэкруты чорт ведае гдзе, а ідзе бараніці свайго краю тагды толька, калі які непрыяцель надыдзе” [4, с. 31], у рэлігійнай сферы беларусы павінны прытрымлівацца уніяцтва. Кастусь Каліноўскі не меў ніякіх сумненняў наконт таго, што менавіта уніяцтва з’яўляецца сапраўды беларускім веравызнаннем. Ён настойліва падкрэслівае гэта. Наколькі важным з’яўляецца для яго дадзены момант, дазваляе меркаваць той факт, што яму быў прысвечаны ўвесь шосты нумар “Мужыцкай праўды”[4, с. 35–37].

Кастусь Каліноўскі – знакавая постаць у нашай гісторыі. Яго ідэі, яго дзейнасць, усё яго жыццё моцна паўплывалі на наш адраджэнскі рух, на духоўнае развіццё беларускага народа ў цэлым [4, с. 22–24]. У гэтай сувязі нельга пагадзіцца з Н.П.Вакарам, які, падкрэсліваючы той факт, што імені Кастуся Каліноўскага “было наканавана стаць у рэшце рэшт сімвалам палітычнай незалежнасці Беларусі” [12, с. 71], даводзіць разам з тым, што палітычныя ідэі беларускага рэвалюцыянера былі расплывістымі і наіўнымі, а таму з’яўляюцца слабай падставай для стваранага вакол яго імя міфа. Гэтаксама і яго роля ў паўстанні 1863–1864 гг. наўрад ці была такой вялікай, якой яна падаецца ў сучаснай беларускай літаратуры [12, с. 72]. Кастусь Каліноўскі аддаў сваё жыццё зусім маладым, і таму цалкам натуральна, што ў яго поглядах выяўляюцца пэўная незавершанасць, уласцівыя маладосці максімалізм і радыкалізм, часам ён занадта паддаецца эмоцыям. Але ў сваёй сутнасці гэтыя погляды вызначаныя і зусім не наіўныя. Гэта датычыць і яго палітычнай пазіцыі, якую даследчыкі яго жыцця і творчасці справядліва характарызуюць як рэвалюцыйна-дэмакратычную [4, с. 7; 5, с. 196–205].

Рэвалюцыйны радыкалізм Кастуся Каліноўскага відавочны і несумненны. Так, у “Пісьмах з-пад шыбеніцы” ён звяртаецца да беларускага народа з наступнымі словамі: “Ты, аднак, Народзе, не дажыдайся, да з чым можаш ідзі ваяваці за свайго Бога, за сваю хвалу, за сваю бацькаўшчызну” [4, с. 45]. Згаданы радыкалізм часам увогуле падаваўся ў перабольшанай, утрыраванай форме. У. Ігнатоўскі прыводзіць «словы, якія прыпісваюцца Каліноўскаму: “Сякера паўстанца не павінна затрымацца нават над калыскаю шляхецкага дзіцяці”» [3, с. 170]. Трэба меркаваць, што гэтыя словы несправядліва прыпісваюцца рэвалюцыянеру, у літаратурнай спадчыне якога мы знаходзім наступныя радкі: “Нічога прасцейшага за гэтае пытанне, якое столькі выклікала марных спрэчак, ці апраўдвае мэта сродкі. Для дасягнення мэты ўжываецца самы мяккі сродак, які можа прывесці да гэтай мэты. Нельга ўжываць сродак, які больш прыносіць шкоды, чым дасягненне мэты карысці. У выбары сродкаў не патрабуем ісці так далёка, як Мураўёў” [4, с. 76]. Радыкальна-рэвалюцыйны светапогляд Кастуся Каліноўскага не надта стасуецца, на першы погляд, з тымі характарыстыкамі, што дамінуюць у менталітэце беларускага народа (талерантнасцю, памяркоўнасцю і інш.). Але дамінаванне згаданых характарыстык зусім не азначае, што менталітэт нашай нацыі зводзіцца да іх і вычэрпваецца імі. Ментальнасць беларусаў значна больш складаная і супярэчлівая, чым падаецца на першы погляд. У рэвалюцыйным радыкалізме Кастуся Каліноўскага выяўляюцца невідавочныя, прыхаваныя яе рысы. Тым не менш яны істотным чынам уласцівыя беларускаму народу, аб чым сведчаць і яго гістарычная практыка, і яго духоўная культура (яскравы прыклад – радыкалізм лірычнага героя вершаў Коласа).

Рэвалюцыйна-радыкальная мадэль барацьбы беларусаў за свабоду, за прызнанне, за самаздзяйсненне як нацыі, якую адстойваў і ўвасабляў у сабе Кастусь Каліноўскі, не была адзінай у згаданую эпоху ў нашай духоўнай культуры. Прынцыпова іншую мадэль, шмат у чым супрацьлеглую першай, прадставіў у сваёй творчасці Вінцук Дунін-Марцінкевіч. У яго творах наш народ паказваецца ў высокім памкненні да “ўсеагульнай самасвядомасці”, у пісьменніка няма ніякіх сумненняў у здольнасці сялянскага люду да здзяйснення агульначалавечых прынцыпаў – у высакародных учынках, у творчасці, у барацьбе са сваімі недахопамі (праўда, гэты паказ набывае ў яго, як правіла, ідэалізаваны характар). І таму вуснамі Агаткі з вершаванай аповесці “Купала” ён выкрывае тых, каму “не грэх мужычку на чэсці забіці, бо мужык нягодны – не боская справа”, пратэстуе супраць таго, што “ўсяк здзекавацца над ім мае права” [2, с. 227].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пісьменнік меркаваў, што яго творы будуць служыць справе выхавання сялян: “Бо ці ж не слушна думаю, што праз іх наш селянін, будучы заахвочаны да навукі чытання, паволі разаўе свой розум, ахоплены дагэтуль цемрай, а змякчаючы звычаі, пазбудзецца ўкаранелых дрэнных заган і заахвоціцца да выканання цяжкога прызначэння ў сваім жыцці” [2, с. 223]. І сам факт, што ён ставіць перад сабой такую задачу, сведчыць аб выспяванні ў нашым народзе патрэбнасці духоўнай дасканаласці. Пісьменнік бачыў сваю заслугу ў тым, што ён “першы паэзію нашага сялянскага люду апрануў у шаты народнай эстэтыкі, увёў на сцэну жыцця і пакінуў у шэрагу твораў айчыннага пісьменства” [2, с. 223]. Зварот да народнай эстэтыкі, гэта значыць прызнанне і выяўленне яе высокай духоўнай каштоўнасці, а таксама зварот да народнай мовы, гэта значыць прызнанне і выяўленне яе грунтоўнага духоўнага патэнцыялу, сапраўды даюць падставы для высокай ацэнкі жыцця і творчасці Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, яго месца ў нашай духоўнай культуры.

Аднак неабходна адзначыць і той факт, што ў постаці пісьменніка факусуюцца грунтоўныя супярэчнасці і цяжкасці працэсу нацыянальнага самавызначэння беларусаў. А.С.Майхровіч адзначае, што “пазіцыя Дуніна- Марцінкевіча як выразніка працэсу станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа не адрозніваецца дастатковай пэўнасцю. Узняўшыся да разумення неабходнасці мастацкай творчасці на беларускай мове, гаворачы аб сваёй сыноўняй прывязанасці да Беларусі, Дунін-Марцінкевіч у плане нацыянальнай прыналежнасці атаясамліваў сябе з польскім народам” [5, с. 146]. Супярэчлівае стаўленне пісьменніка да беларушчыны выяўляе складаныя калізіі, вострую барацьбу супрацьлеглых сіл і памкненняў як у свядомасці, так і ў бессвядомай сферы душы беларуса і паказвае з усёй відавочнасцю, што шлях да фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і вызвалення ад комплексу непаўнавартасці ўласнай культуры мусіць быць у нашым выпадку ў вышэйшай ступені драматычным.

Іншага шляху, аднак, беларусам не дадзена, яго неабходна прайсці, і першыя крокі, зробленыя ў патрэбным кірунку, маюць каласальнае значэнне, бо яны далі адчуванне здольнасці рухацца, ісці наперад – да свайго самаздзяйснення як свабоднага і роўнага з іншымі народамі. Надзвычай важным набыткам першага перыяду нашай нацыятворчай дзейнасці было адраджэнне літаратурнай пісьмовай традыцыі. Дзякуючы гэтаму прадстаўнікі суседніх народаў, якія кіраваліся мэтамі, супрацьлеглымі нашым нацыянальным інтарэсам, пачалі звяртацца да нашага народа на яго мове [12, с. 80–81] і аб’ектыўна спрыялі таму, што яна “набыла новае значэнне і маральную сілу” [12, с. 82].

З вялікай любоўю да матчынай мовы і ў вышэйшай ступені пранікнёна выявіў яе “новае значэнне і маральную сілу” Францішак Багушэвіч. Гэта засведчыла памкненне нашага народа зрабіць новы крок наперад у пераадоленні “рабскай” самасвядомасці ў тым, што датычыць грунтоўных характарыстык і модусаў яго існавання як нацыі, на першым месцы сярод якіх стаіць мова. Францішак Багушэвіч падкрэслівае, што “мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская альбо нямецкая, альбо і іншая якая” [1, с. 16]. Атрыбуты нашага нацыянальнага існавання ні ў чым не саступаюць нацыянальным атрыбутам іншых народаў, бо мы як нацыя ні ў чым не саступаем іншым. Аддадзім належнае Францішку Багушэвічу: ён здолеў намацаць ці не самую балючую праблему ў беларускай культурнай прасторы і тэматызаваць яе з вялікай духоўнай сілай. Паэт далучае мову да святыняў нашага народа, адмова ад яе, паводле паэта, раўназначная духоўнай смерці.

Іншую сітуацыю мы маем у выпадку з беларускімі народнікамі, якія напачатку 80-х гг. XIX ст. абвясцілі аб сваім памкненні “выступіць на барацьбу за вызваленне беларускага народа” [6, с. 3], за прызнанне яго як нацыі і абвясцілі гэта на рускай мове. Д.Дзінглі патлумачыў дадзены факт тым, што для іх “у гэты час галоўнай задачай было сацыяльнае вызваленне. Ідэі нацыянальнага вызвалення, прынамсі ў беларусаў, павінны былі прыйсці пазней” [8, с. 449]. Але аналіз адпаведных першакрыніц не пацвярджае гэтую тэзу. Хаця суадносіны сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення народа застаюцца ў маладых беларускіх рэвалюцыянераў шмат у чым нявысветленымі [7, с. 81], матывы нацыянальнага вызвалення выразна гучаць у іх публіцыстыцы. Яны бачылі вялікую і святую задачу беларускай інтэлігенцыі ў тым, каб “разварушыць магутныя сілы свайго народа, накіраваць спыненае прагрэсіўнае развіццё яго, даць яму магчымасць выявіць свой нацыянальны

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

геній, глыбока схаваны ад драпежніцкіх намераў палякаў і вялікарускага двухгаловага арла” [6, с. 70].

Высакародная адданасць новага пакалення беларускіх рэвалюцыянераў беларускай нацыянальнай ідэі не надта стасуецца з ужываннем імі рускай мовы для прапаганды сваіх поглядаў. Але як бы мы ні тлумачылі дадзены факт і як бы ні тлумачылі свой моўны выбар самі народнікі [6, с. 21, 111–112], ён адлюстроўвае драматычную сітуацыю з роднай мовай у беларускай культурнай прасторы. Тым не менш рэвалюцыйная дзейнасць беларускіх народнікаў выступае як важны кірунак духоўных пошукаў нашага народа, з’яўляецца яскравым сведчаннем узмацнення яго свабодалюбных памкненняў – таго працэсу, што прывёў напачатку дваццатага стагоддзя да ўздыму беларускага нацыянальнага руху, да сапраўднага скачка ў фарміраванні “ўсеагульнай” нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Такім чынам, істотныя характарыстыкі апісанага класічнай філасофіяй феномена барацьбы за прызнанне выразна выяўляюцца ў нашай духоўнай культуры. Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці нашага народа цесна знітавана з фарміраваннем у яго “ўсеагульнай самасвядомасці”, што з’яўляецца вынікам нястомнай духоўнай працы. Якім чынам і наколькі досвед, набыты нашым народам у тых складаных варунках, можа быць скарыстаны ў сучасных умовах, калі набіраюць моц глабалізацыйныя працэсы, мусіць быць тэмай спецыяльнага даследавання. Не выклікае ніякіх сумненняў, аднак, што гэты досвед – досвед узняцця на больш высокую ступень самаарганізацыі ва ўмовах надзвычай моцнага знешняга ціску – павінен быць задзейнічаны ў нашых сённяшніх высілках, скіраваных на захаванне нашай ідэнтычнасці і развіццё нашай культуры.

1. *Багушэвіч, Ф.* Творы: вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф.Багушэвіч / уклад., прадм. Я.Янушкевіча. – Мн.: Маст. літ., 1991. – 309 с.

2. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Творы / В.Дунін-Марцінкевіч [уклад., прадм. і камент. Я.Янушкевіча]. – Мн.: Маст. літ., 1984. – 527с.

3. *Ігнатоўскі, У.М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М.Ігнатоўскі; уступ. арт. А.П.Грыцкевіча; камент. і заўвагі Э.Н.Гнеўкі. – 5-е выд. – Мн.: Беларусь, 1992. – 190 с.

4. *Каліноўскі, К.* За нашую вольнасць / К.Каліноўскі // Творы, дакументы / К.Каліноўскі; уклад, прадм., паслясл. і камент. Г.Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – 464 с.

5. *Майхрович, А.С.* Поиск истинного бытия и человека: из истории философии и культуры Беларуси / А.С.Майхрович; под ред. Д.И.Широканова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 247 с.

6. *Публицистика* белорусских народников / [сост., подгот. текстов С.Х.Александровича и И.С.Александрович]. – Мн.: Изд-во БГУ, 1983. – 134 с.

7. *Радзік, Р.* Пецярбургскі “Гоман” як пачынальнік беларускай нацыянальнай ідэі ў 19 стагоддзі / Р.Радзік // Нацыянальныя пытанні: матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый” (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000г.) / рэдкал.: Э.Дубянецкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 76–87.

8. *Handbuch* der Geschichte Weiβruβlands / hrsg. von D.Beyrau und R.Lindner. – Göttingen: Vandenhoeck & Ruprecht, 2001. – 543 S.

9. *Hegel, G.W.F.* Enzyklopädie der philosophischen Wissenschaften im Grundrisse (1830) / G.W.F.Hegel. – Berlin: Akademie-Verlag, 1975. – 506 S.

10. *Hegel, G.W.F.* Phänomenologie des Geistes / G.W.F.Hegel. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1973. – 621 S.

11. *Ottman, H.* Herr und Knecht bei Hegel. Bemerkungen zu einer miβverstandenen Dialektik / H.Ottman // Zeitschrift für philosophische Forschung. – Bd. 35. – H.3/4. – Meisenheim / Glan: Hain, 1981. – S. 365–384.

12. *Vakar, N.P.* Belorussia: The Making of a Nation / N.P.Vakar. – Cambridge, Massachusets: Harvard University Press, 1956. – 297 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ